**Гадзіна памяці “Памяць аб Міколе Засіме не гасне з гадамі”**

**Мэта:**

- аднавіць і захаваць для нашчадкаў імёны і гістарычныя здзяйсненні нашых славутых землякоў-патрыётаў бацькаўшчыны

**Задачы:**

- вывучэнне і даследаванне дзейнасці знакамітых землякоў;
- ушанаванне памяці і арганізацыя мерапрыемстваў у гэтым накірунку;
- выхаванне павагі і любові да нашых знакамітых землякоў.

Ход мерапрыемства

*Гучыць музыка*

**Бібліятэкар**. Есць паэты, вядомыя больш на сваёй радзіме, чым на чужыне. Шчаслівыя паэты!.. Пастаянная прапіска на бацькоўскай зямлі не прыніжае іхнюю Музу. Наадварот, надае ёй трываласць, а вершы набываюць новую каштоўнасць. Такім паэтам для нас з’яўляецца наш зямляк Мікола Арцёмавіч Засім.

Мая пружанская зямліца,
Твае палі і сінь нябёс
Мне будуць бачыцца і сніцца,
Куды б мяне ні кінуў лёс.

Гэтыя шчырыя радкі з верша «Родная зямліца» напісаны Міколам Засімам у перадапошнія гады яго жыцця. Паэт, як быццам, спяшаўся выказаць свае пачуцці да роднай зямлі, на якой шмат пагараваў і якой вельмі ганарыўся.

Мая ты родная зямліца,
Хто палюбіў цябе навек,
Таму ты творчасці крыніца
І той шчаслівы чалавек.

Няўмольны лёс адмераў таленавітаму творцу з вёскі Шэні Пружанскага раёна няпоўных 49 гадоў, але яны былі надзвычай насычаныя падзеямі. А творчасць Засіма - цікавая з'ява ў беларускай літаратуры. Яна грунтуецца на глебе фальклору і грамадскага самавызначэння асобы. Невыпадкова яна была яшчэ пры жыцці нашага паэта-самародка прызнана такімі майстрамі слова як Пілíп Пястрак, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, Аляксандр Твардоўскі, Міхаіл Луконін…Усё тое лепшае, што створана Міколай Засімам, пазначана пячаткай самабытнасці і даўгалецця…

**Вядучы 1.** Восенню 19 лістапада 1908 года ў невялікай вёсцы Шэні Пружанскага павета, у сям'і селяніна, нарадзіўся Мікола Засім. Бязрадасным было дзяцінства хлопчыка. Беззямелле, недаяданне, галеча пагналі бацькоў разам з дзецьмі ў Саратаўскую губерню. Але і там не соладка давялося ім. Голад на Паволжы прымусіў сям'ю Засімаў вярнуцца ў родную вёску.

**Вядучы 2.** Мікола Засім 17-гадовым юнаком пачаў пісаць вершы. Парабкуючы ў кулакоў і памешчыкаў, працуючы на лесапільным заводзе, малады паэт расказваў у сваіх вершах аб цяжкім жыцці беларуса пад панскім ярмом.

Мы нічым так не багаты,
Як багаты мы бядой.
Нашы хаты - ў шыбах латы,
Сцены сыплюцца трухой.
Наш кажух - у куце плесня,
Электрычнасць - корч смальны,

Плача з намі наша песня
Пад хаўтурныя званы.
Наша страва - з квасам бульба,
Наш абутак - гумаў круг,
Наш цягнік - у рукі кульба,
Голад - верны брат і друг.

**Вядучы 1.** З першых твораў паэзія Засіма па духу становіцца масавай. Паэт выражае масавыя імкненні, масавыя пачуцці заходнебеларускага працоўнага сялянства.

**Вядучы 2.** Вершы сялянскага самавука таго часу густа аздоблены іроніяй, сатырай, сарказмам. Паэт смяецца з так званай «панскай культуры». Пад яго пяром вобразы набылі непаўторную самабытнасць і арыгінальнасць.
А паны ўсё - на “культуру”;
Аж духі нам падвяло,
Каб яе на вашу скуру,
Можа б гэта памагло
**Вядучы 1.**Мікола Засім становіцца камсамольцам, затым камуністам, удзельнічае ў рэвалюцыйным руху. Не раз ён падвяргаўся праследаванню з боку белапольскіх улад. У 1925 годзе першы арышт. Амаль год правеў Засім у пружанскай турме, выпусцілі яго толькі з увагі на маладлецтва.
"Мяне часта арыштоўвалі, білі у пастарунках і засценках дэфензівы" - згадвае М.Засім ва ўспамінах. Але і ў турме паэт не перастае пісаць вершы.
Маю я пакой асобны,
Гардэробу шмат:
Нары, столічак свабодны,
Проста як магнат.
Спаць паложаць,
Збудзяць рана,
Есці паднясуць
І на шпацыр пад ахранай,
Як туза, вядуць.
**Вядучы 2.**Паэту ўсяго 19 год, а ён ужо тры гады ўдзельнічае ў заходнебеларускім камуністычным падполлі. Рэвалюцыйная дзейнасць Шэняўской камсамольскай ячэйкі маскіруецца шыльдаю легальнага гуртка Грамады.
“Вас прашу, сябры – вяскоўцы,
Цешце вёску шчырым слоўцам,
Словам бойкім, шчырым словам,
Каб вясковы брат гатовы
Быў адпор даць паняверцы”
І яшчэ…………………………………………
“Стань у рады змагароў,
Дзяўчына мая!
Выкінь з думак сваіх
Асабістае Я...”
Гэты наіўна-ўрачысты заклік - першы паэтычны след Засіма на беларускай мове.
**Вядучы 1.** Дэбютаваў ён у 1928 годзе на старонках віленскага сатырычнага часопіса "Маланка" вершам "Ні кароўкі, ні мандата" пра ўладальніка маёнтка, пана Быхаўца. Друкуецца пад псеўданімамі: Асот, М.Асот, Ацот, М.Крывіцкі, Міз, Хлопец.
**Чытальнік**. Паслухайце што пісаў Уладзімір Калеснік.
«Засім на пачатку сваёй літаратурнай дарогі дайшоў да ісціны, што мастацкі твор складаецца не проста са слоў, а з жыццёвага лёсу самогааўтара і яго чытача... Напісанае ім было праўдзівым і самабытным. Сказаць праўду ў тую пару азначала задзець несправядлівы і аблудны парадак жыцця... творчая праца вымагала не толькі дапытлівасці, а перад усім сумлення і грамадзянскай мужнасці...»
**Вядучы 2.**Нельга было знайсці чалавека больш актыўнага ў грамадскім жыцці. Мікола разам з перадавой моладдзю Шэняў наладжваў спектаклі, якія з трыумфам праходзілі не толькі ў роднай і ў суседніх вёсках, а таксама і ў Пружанах (з 1930 па

1932 гады было пастаўлена 10 спектакляў). Ён таленавіта спяваў, выконваў камедыйныя ролі, іграў на балалайцы ў вясковым аркестры. Як загадчык вясковай бібліятэкі Таварыства беларускай школы Мікола Засім меў добрую магчымасць займацца самаадукацыяй. У сяброў і знаёмых юнак браў кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цёткі, Кандрата Крапівы, Міхася Чарота

**Вядучы 1.**У 1934 годзе М.Засім быў ужо дастаткова вядомы ў Заходняй Беларусі паэт. Арганізатары Літаратурнага фонду сялянска-рабочых пісьменнікаў запрашаюць яго ў Вільню на нелегальны ўстаноўчы сход новай літаратурнай арганізацыі. М.Засім памкнуўся быў ехаць, але паліцэйскі патруль затрымаў яго на чыгуначнай станцыі. Заходнебеларускім паэтам ён адрасаваў вершаванае пісьмо:

Гэй, паэты, вескі й поля,
Я ваш сябра - Засім Коля,
З-пад Пружанаў, з вескі Шэні,
І ў мяне, браты, ў кішэні
Часта грошаў брак на марку,
Рэдка ў страве бачу скварку,
Бульбай усенька пакрываю,
Гумы цяжкія цягаю.
Ды не падаю на дусе!
Для працоўных Беларусі
Цераблю я шлях дзярновы,
У верш уплятаю з сталі словы.
І аб радасці змагання пяяць буду да скanання.

**Вядучы 2.**Створанае Засімам да верасня 1939 г. арганічна ўвайшло ў скарбніцу беларускай літаратуры. На фоне рэвалюцыйнага ўздыму мас самавітая фігура Міколы Засіма набывае сімвал народнага абаронцы, пеюна і звестуна. Ен пачынае верыць у сваё паэтычнае прызначэнне, у яго творчасці з’яўляецца тэма паэта і народа, якую ён распрацоўвае да канца жыцця.

Дзе ні глянь — паэтаў,
Як на дрэве лісця,
Слізкіх, як паркеты
Панскія калісьці.
А вось мне падобных
З іх замалавата.
Я пяром, як доўбняй,
Глушу трыбухатых.
Мо яно й нязграбна,
Ды затое ёмка.
Верш каструбаваты,
Як з пянька пастромка:
Плуг зачэпіш — цягне,
Не пакіне ззаду.
На пятлю згадзіцца
Дзе якому гаду.

**Вядучы 1.**Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ад панскай няволі творчасць Міколы Засіма пайшла па другому рэчышчу. Паэт піша шмат вершаў аб новым, шчаслівым жыцці. Увесь час працуе і жыве ў гушчы народа. Ён выбіраецца старшынёй сельсавета ў Пружанскім раёне. Сувязь з народам, з яго жыццём відаць і ў творчасці паэта. Мікола Засім публікуе шэраг вершаў, у якіх вітае савецкую ўладу, што ў верасні 1939 года прыйшла на заходнія землі Беларусі:

Край новага рання! Саветаў краіна!
Прымі прывітанне Міколы Засіма
З вёскі Шэні ў Пружанскім павеце,
Якую найгоршай лічыў пан на свеце

**Вядучы 2 .** Вайна прымусіла Міколу Засіма зноў стаць на дарогу змагання. У дні Вялікай Айчыннай вайны Мікола Засім, як і тысячы беларускіх сыноў, устаў на абарону Радзімы. Паэт з першых дзён вайны становіцца падпольшчыкам, а вершы той пары нагадваюць палітычныя лістоўкі.

Пісаць пра волю — гэта мала,
Без справы слова —гэта грош,
Трэ, каб адна рука трымала
Пяро, другая — востры нож

**Вядучы 1.**У гэтыя дні паэт стварыў рад вершаў, якія заклікалі савецкіх людзей да помсты ворагу:
На бой, народ, мацуйся духам,
Скідай нявольніцкі ланцуг!
**Вядучы 2.**У сакавіку 1942 года Мікола Засім уступае ў адзін з першых партызанскіх атрадаў на Пружаншчыне. Ён гарэў жаданнем бязлітасна помсціць гітлераўскім захопнікам за параненую зямлю. У снежні 1943 года ён быў прызначаны інструктарам антыфашысцкага камітэта Брэсцкай вобласці. Ішоў з атрада ў атрад, наладжваў сувязь, прыносіў інструкцыі ад кіраўнікоў камітэта.
**Вядучы 1.** Моцнай зброяй у барацьбе з ворагамі сталі яго вершы, якія ён пісаў у паходах, у перапынках паміж баямі, у халоднай зямлянцы, часта чытаў у партызанскім шпіталі, са сцэны клуба-зямлянкі. У Засіма быў тоўсты сшытак у чорных каленкоравых вокладках, ён насіў яго ў палявой сумцы, а ў часе блакад хаваў у бацькаву шпакоўню на бярэзіне. Паэт заносіў у гэты сшытак радкі, якія часта прыходзілі на думку на маршы.
**Вядучы 2.**У вершах Засіма вострым болем адгукнуліся першыя месяцы вайны і неспадзяванага адступлення нашай арміі, забойным смехам і гневам заклеймаваў паэт антысаветчыкаў. Але найбольшае месца заняла тэма пакуты народа і бяспрыкладнае ўсенароднае змаганне супраць смяротнага ворага:
Распухла зямліца
Ад людскіх магіл,
На сонца дзівіцца
Праз дым няма сіл.
**Вядучы 1.** Бадай, у ніводнага беларускага пісьменніка мы не сустрэнем такога поўнага і да жаху дакладнага паэтычнага дзенніка акупацыі, як у Засіма.
**Вядучы 2.** Партызанскія вершы М. Засіма — гэта цэлы летапіс бяспрыкладнага ўсенароднага гераізму, помнік партызанам.
**Вядучы 1.** Паэт у самым віры трагічных падзей. Фашысты расстралялі яго старых бацькоў, вывезлі ў няволю сястру. Але знаходзіў сілы народ, не зламаў яго волю фашысцкі тэрор, лавінаю ішлі вясковыя дзецюкі і дзяўчаты ў партызаны. Баявое братэрства памагае паэту пераадолець боль трагічных пакут:
Не застрашыце нас, каты,
Ні расстрэлам, ні пятлёю,
За кроў маткі, за кроў таты,
Сваю помсту я утрою.
А калі загіну ў бойцы,
Дык такі я не адзін.
Будзе помсціць вам, забойцы,
Друг мой — іншай маткі сын
**Вядучы 2.**Шчырая і надзённая паэзія нашага земляка мела поспех. Яна была заўважана і партызанскім камандаваннем, якое неўзабаве накіравала Засіма на працу ў рэдакцыю падпольнага органа Брэсцкага абкома партыі - газету "Заря", якая выдавалася ў зоне Спораўскіх балот...
**Вядучы 1.**За ўдзел у Айчыннай вайне і праяўленую адвагу ў баявых аперацыях партызан Мікола Засім быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.
**Вядучы 2.**У1944 годзе нястомны змагар назначаецца намеснікам старшыні Пружанскага райвыканкама і на гэтай пасадзе ён быў да 1946 года. З 1945 года ён член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Затым - вучоба ў Рэспубліканскай партыйнай

школе пры ЦК КПБ, пасля якой ён стаў працаваць у 1948 годзе ў брэсцкай абласной газеце "Зара", а потым і ў раённай газеце "Заря над Бугом".

**Вядучы 1.**У Брэсце паэт узначальвае абласное літаратурнае аб'яднанне і дапамагае многім маладым літаратарам стаць на ногі. Шмат цяперашніх берасцейскіх літаратараў атрымалі благаславенне на слугаванне роднаму слову менавіта ад Засіма.

**Бібліятэкар**. Пра гэты перыяд яго жыцця гаварыў даследчык творчасці Міколы Засіма **У. Калеснік:** "Самы каштоўны ўрок з усіх, якія даваў Мікола Засім літаратурнай моладзі на Брэстчыне, — гэта прыклад. Мікола Засім увасабляў у вачах юнакоў і дзяўчат прыклад сапраўднага "жывога" паэта, які вырас на той жа зямлі, на якой раслі яны, і данёс яе клопаты і радасці да слыху ўсёй шматнацыянальнай краіны. Засім быў тутэйшым паэтам, якога хваліў не толькі па-зямляцку Піліп Пестрак, але і Максім Танк ды Аркадзь Куляшоў, а перакладаў і друкаваў у "Новом мире" Аляксандр Твардоўскі".

**Вядучы 1.**У пасляваеннай лірыцы паэта ў пераважнай большасці славіцца гераізм беларускага народа ў гады ваеннага ліхалецця. Творчая думка Міколы Засіма доўга не магла вырвацца з-пад улады перажытага. У вершах яго грымелі баі... Менавіта ў героіка-вызваленчай тэме паэт дасягаў найбольшай вышыні

**Вядучы 2.**Асоба паэта і лірычнага героя з году ў год узбагачалася новымі душэўнымі рысамі і ўзбагачала вершы такімі матывамі, як дружба і каханне, старасць і маладосць, сям'я і мацярынства.

**Вядучы 1.** Ён спазнаў радасць запозненага кахання. Адчуваў сябе шчаслівым, што ўцалеў у вайну, што лёс паслаў яму прыгожую сінявокую дачушку. За бацькоўскай любоўю да дачкі ў вершы "Сінія вочы", напісаным за два гады да смерці і звернутым да сяброў, бачыцца вялікая любоў да жыцця, да людзей.

Сінія вочы, сінія вочы…
Я паміраці сёння не хочу,
Смерць калі ж прыйдзе, ведайце, людзі,
Засім змагацца, дужацца будзе,
Бо сінія вочы дачуркі, паверце,
Мне адагнацца памогуць ад смерці…

**Вядучы 2.** Бясспрэчна, Засім мог бы яшчэ сказаць шмат цікавага і карыснага свайму народу, калі б заўчасная смерць не абарвала яго шчырай песні.

**Бібліятэкар**. Пры жыцці паэта выйшлі толькі два яго зборнікі: у 1947 годзе — "Ад шчырага сэрца" і ў 1954 годзе - "Вершы". "На Брэстчыне жыў і працаваў таленавіты беларускі паэт Мікола Засім. Яго кнігі вершаў "Ад шчырага сэрца" і "Вершы" прасякнуты цёплай любоўю да роднага краю, да простых людзей працы". (Пётр Машэраў)

**Вядучы 1.** Аляксандр Твардоўскі, першы перакладчык вершаў Міколы Засіма на рускую мову. Сярод вершаў, перакладзеных Твардоўскім, быў адзін, асабліва дарагі Міколе Засіму - аўтабіяграфічны верш "Сястра мая"

Ты дзе цяпер, сястра мая,
Аб гэтым я не знаю.
Адно, аб чым дачуўся я:
Схапілі паліцаі.
Іпавязлі на Беласток,
У Прусію рабою,
Іхлеба не далі кусок
Узяці каб з сабою.
Каб па дарозе не ўцякла,
Скавалі рукі туга,
Ікаля кожнага сяла
Цябе сцябалі пугай.
Табой наводзілі ўсім страх,
Каб усе былі пакорны,

А я, сястрыца, у карчах
Аблёг, быў моцна хворы.
Не мог, любімая, павер,
Прыйсці на дапамогу..
Заліў крывёю люты звер –
Усе шляхі, дарогі.
Ты дзе цяпер, сястра мая,
Аб гэтым я не знаю.
Адно — надзею маю я,
Ў Берліне што спаткаю.

**Бібліятэкар.** Раскрыць сутнасць паэзіі Засіма, паказаць яе моцныя і слабыя бакі, вызначыць месца паэта ў беларускай літаратуры, асабліва ў яе заходнебеларускім перыядзе, удалося найперш Уладзіміру Калесніку. Ен адшукаў паэтычны партызанскі дзённік Засіма, беражліва выпісаў з яго вершы і ў адной з трох сваіх прадмоў да зборніка паэта цвёрда, без перабольшання, сказаў: «Ніводзін паэт Беларусі не адлюстраваў партызанскай эпапеі ад пачатку да канца яе паводле ўласных уражанняў і перажыванняў, як гэта давялося зрабіць Міколу Засіму».

**Вядучы 2.**Усяго, што тут ужо сказана пра Міколу Засіма, недастаткова, каб уявіць яго як асобу неардынарную, якой былі ўласцівы і трапны гумар, і незайздросная прамалінейнасць, і славеснае грубіянства, і нейкія іншыя недахопы ў складзе яго характару і паводзінах.

**Бібліятэкар.** Можна бясконца чытаць і перачытваць простыя, немудрагелістыя радкі паэта, і яны заўжды па-новаму будуць адкрываць нам мінулае берасцейскага краю, жыццё і барацьбу народа, яго мірную стваральную працу. Адкрываецца ў іх душа Засіма, што выдыхнула, як запавет, словы:

Я гляджу праз вакно,
як пажоўклы зноў ліст
Асыпаецца з клёнаў павалі...
Гэтаксама і будзе са мною калісьць —
Занясе мяне ветрам у полі.
Адарвуся, як ліст, ад жывога галля,
Замаўчыць мая муза навекі...
Толькі тая ралля, што ўзараў вершам я,
Рунню будзе цвісці на карысць чалавеку.

"Ён быў сынам народа ў поўным значэнні гэтага слова..." ( **М.Танк )**

**Бібліятэкар.** "Ён быў сынам народа ў поўным значэнні гэтага слова..." ( **М.Танк )**
Паэт не пражыў і паўвека. Але вершы яго жывуць. Жывуць не толькі на Пружаншчыне і не толькі на Палессі - жывуць у шырокім свеце нашай беларускай культуры. Родная зямліца надарыла яго даўгалецццем. Яго імя носіць наша ўкола, з 1988 года імя Міколы Засіма носіць Пружанская раённая бібліятэка. Да 95-годдзя з дня нараджэння паэта у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Міколы Засіма адчыніўся літаратурны пакой. У Брэсце на будынку № 40 па вуліцы Камсамольскай памяць нашага славутага земляка ўшаноўвае мемарыяльная дошка. Да 100 – гадовага юбілею паэта на будынку цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Засіма ўстаноўлены барэльеф Міколы Засіма.

**1 Вядучы.** "Сапраўды, паэзія – гэта не толькі словы і вобразы, за якімі часта ганяюцца модныя творцы, колькі подых чалавечай душы, І калі гэты подых ёсць у цябе, тады будуць жыць у народзе твае словы і вобразы, паэт…" **(Анатоль Гарай)**